© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012


# БАЦЬКАЎШЧЫНА

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUSČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck. „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: Нямеччына: на год. — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; ЗША і Канада: на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 м. Ангельшчына й Аўстралія: 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. Бэльгія: 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. Францыя: 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. Аргентына: 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. Перасылка л[illegible]іцкай поштай каштуе падвойна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна. Паадзіночныя нумары газэты разам з «Каласкамі» ўважаюцца за падвойныя.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 П. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "THE FATHERLAND"

№ 20 (504) Нядзеля, 15 травеня 1960 ГОД ВЫДАНЬНЯ 14


# Перад Парыскай Канфэрэнцыяй

Яшчэ ня было ніводнай міжнароднай канфэрэнцыі пасьля заканчэньня апошняе вайны, да якой ейныя ўдзельнікі гэтак доўга й грунтоўна прыгатаўляліся-б, як да цяперашняй канфэрэнцыі на найвышэйшай узроўні ў Парыжы.

Ужо вялікія падарожжы прэзыдэнта Айзэнгаўэра ў краіны Паўдзённа-Ўсходняй Азіі й Лацінскае Амэрыкі, брытанскага прэм'ера Макміляна ў Паўдзённую Афрыку ды напасьледак Хрушчова таксама ў краіны Паўдзённа-Ўсходняй Азіі, хаця й былі выкліканы беспасярэднімі патрэбамі ў змаганьні за палітычныя ўплывы, сваей далейшай мэтай мелі награмаджаваньне палітычнага капіталу для парыскіх нарадаў. Далей падарожжы Хрушчова ў Вялікабрытанію, Задзіночаныя Штаты Амэрыкі й Францыю былі таксама задуманы галоўным чынам у мэтах падняцьця аўтарытэту Савецкага Саюзу й асабіста Хрушчова з гледзішча на парыскае спатканьне, якое мае стацца вялікім спаборніцтвам між Захадам і Ўсходам у роўніцы найважнейшых праблемаў палітыкі.

Дык калі ўспомненыя палітычныя падарожжы мелі характар гэтага спаборніцтва між Захадам і Ўсходам ў галіне палітычнага падмацаваньня кожнага з партнэраў, дык нязвычайна інтэнсыўныя й частыя падарожжы ў рамах толькі заходняга блёку былі выкліканыя няўхільнай патрэбай узгадненьня й каардынацыі палітычнае лініі заходніх саюзьнікаў узноў-жа з гледзішча на Парыскую канфэрэнцыю. Да такіх падарожжаў належаў аб'езд краінаў Заходняе Эўропы прэзыдэнтам Айзенгаўэрам летам мінулага году, а так-жа адведзіны Амэрыкі Макмілянам, Адэнаўэрам і Дэ Голем.

Узьнікае ўражаньне, што цяперашняе спатканьне на найвышэйшай узроўні, другое пасьля такога-ж спатканьня ў Жэнэве летам 1955 году, павінна стацца падзеяй вялізарнага гістарычнага значаньня, нейкім зваротным пунктам у змаганьні між Захадам і Ўсходам і ў сваіх выніках прынесьці капітальныя разьвязкі неразьвязаных на працягу ўсяго пасьляваеннага пэрыяду сьветавае вагі праблемаў. Выходзячы з гэтага, варта задаць сабе пытаньне, якія шансы ўдачаў мае цяперашняе спатканьне на найвышэйшай ўзроўні і якіх канкрэтных вынікаў можна ад яго спадзявацца? Канкрэтнага матарыялу, каб адказаць на гэтае пытаньне, апошнім часам назьбіралася дастаткова.

Галоўнай мэтай канфэрэнцыі ёсьць, як ведама, ліквідацыя або прынамся злагоджаньне сьветавага напружаньня, якое, у выпадку ягонага далейшага паглыбленьня й завайстрэньня, хавае ў сабе загрозу новае сьветавае вайны. Канкрэтна канфэрэнцыя будзе займацца праблемамі, якія гэтага напружаньня зьяўляюцца галоўнай прычынай: праблемай раззбраеньняў, пытаньнем задзіночаньня Нямеччыны й справай Бэрліну.

У гэтых кардынальных пытаньнях, вакол якіх разыгрываюцца многія іншыя палітычныя падзеі, пазыцыя Захаду апошнім часам больш менш устабілізавалася й разыходжаньні між ягонымі галоўнымі партнэрамі, спрычыненыя перадусім угодніцкімі тэндэнцыямі Вялікабрытаніі ў дачыненьні да Савецкага Саюзу, злагоджаныя. Такім чынам, ня гледзячы на больш цьвёрдую й станоўчую пазыцыю Амэрыкі, чымся яе эўрапэйскіх саюзьнікаў, а галоўна тэйжа Вялікабрытаніі, кіраўнікі заходніх вялікадзяржаваў выступяць на канфэрэнцыі ўзгодненым фронтам. Гэта трэба аднесьці да дадатніх дасягненьняў заходняе палітыкі.

Аднак вельмі шмат цешыцца з такога скаардынаваньня палітычнае лініі яшчэ ня прыходзіцца. Захад, як і ўвесь час перад гэтым на працягу ўсяго пасьляваеннага пэрыяду, прыгатаваны выступаць усяго толькі з чыста абаронных пазыцыяў, навет і ня думаючы перайсьці да пазыцыяў наступальных, на якіх стаіць увесь час Савецкі Саюз. Неаднакратныя намеры Задзіночаных Штатаў Амэрыкі, каб на савецкія ўдары адказаць собскімі контрударамі, а там, дзе трэба, такія ўдары наносіць праціўніку, ня будучы ім справакаваным да гэтага, заўсёды паралiжаваліся й цяпер паралiжуюцца эўрапэйскімі саюзьнікамі Амэрыкі.

Прыкладам у Вялікабрытаніі ўжо вытварылася канцэпцыя, што калі навет канфэрэнцыя на найвышэйшай узроўні ня прынясе для Захаду абсалютна ніякіх пазытыўных вынікаў, дык усёроўна шмат карысьней калі яна адбудзецца, чымся калі-б зусім не адбылася. Прэзыдэнт Францыі Дэ Голь апошнім часам пайшоў яшчэ далей. Выступаючы нядаўна перад амэрыканскім Кангрэсам у справе ўзаемадачыненьняў між Захадам і Ўсходам, прэзыдэнт Францыі выказаўся ўсяго толькі за ўстанаўленьне свайго роду modus vivendi, за захаваньне status quo, што, на ягоную думку, павінна прывесьці да жаданага адпружаньня. Затое перасьцерагаў перад намаганьнямі разьвязаньня спрэчных канкрэтных праблемаў, перад «жаданьнямі заключэньня трактатаў», устанаўленьня граніцаў, зьмены статуту ў найбольш задражненых раёнах». Усё гэта было-б дрэнным і лёгкадумным крокам, які прывёў-бы да пагоршаньня дачыненьняў з Савецкім Саюзам.

У іншай прамове, сказанай у Амэрыцы, Дэ Голь выказаўся навет супраць спробаў разьвязваньня ў сучасны мамэнт нямецкае праблемы й справы Бэрліну. Разьвязаньне гэтых праблемаў, паводля Дэ Голя, мае наступіць пазьней, паступова, само сабой у выніку дасягнутага адпружаньня, якое, на ягоную думку, зусім магчымае бязь ніякіх канкрэтных перадумоваў, а толькі дзякуючы добрай волі самога Хрушчова.

На прэсавай канфэрэнцыі ў Вашынгтоне Дэ Голь схарактарызаваў Хрушчова, як «чалавека сільнага», які ўсё жыцьцё змагаўся за свае ідэялы. Паводля Дэ Голя, «Савецкі Саюз ня можа быць лепш рэпрэзэнтаваны, як чалавекам, які выражае найдакладней становішча сяньняшнай Расеі. Гэта ня ёсьць учарашняя Расея, а навет тая зь перад дзесяцёх год». Прыходзіцца проста дзівіцца, да якой несамавітай канцэпцыі прыйшоў прэзыдэнт Францыі, які верыць у дасягненьне адпружаньня бязь ліквідацыі ягоных прычынаў.

Затое Хрушчоў добра ведае, чаго хоча ад сваіх заходніх партнэраў. Сваё становішча апошнім часам кіраўнік савецкае дзяржавы гэтак ясна сфармуляваў, што для заходніх дзяржаўных мужоў не пакінуў ніякіх сумлеваў.

У сваёй прамове ў Баку на паседжаньні Вярхоўнага Савету Азэрбайджанскай ССР у канцы красавіка Хрушчоў у справе Бэрліна злажыў на толькі грознае асьветчаньне, што Савецкі Саюз усё-ж падпіша сэпаратны мірны дагавор з Усходняй Нямеччынай. Пры гэтым заявіў: **«Заходні Бэрлін знаходзіцца на тэрыторыі Нямецкай Дэмакратычнай Рэспублікі. Фактам заключэньня мірнага дагавору Усходняя Нямеччына абыйме сваімі сувэрэннымі правамі ўсю тэрыторыю. Калі заходнія дзяржавы адмовяцца падпісаць мірны дагавор зь Нямецкай Дэмакратычнай Рэспублікай, дык бясспрэчна страцяць права доступу ў заходні Бэрлін на зямлі, вадзе і ў паветры».**

Сваё становішча, якое мае заняць на канфэрэнцыі ў Парыжы, з усей яснасьцю выказаў Хрушчоў у даўжэзнай прамове на апошняй сэсіі Вярхоўнага Савету СССР. Заявіўшы, што Савецкі Саюз галоўнай сваёй мэтай ставіць ліквідацыю сьветавага напружаньня, умаца-

(Заканчэньне з 2-ой бач.)

# Дружба й раўнапраўнасьць, ці паняволеньне й дыскрымінацыя

20-га красавіка газэта «Советская Белоруссия» прысьвяціла свой передавы артыкул Леніну, як «арганізатару шматнацыянальнай савецкай дзяржавы». У гэтым артыкуле яшчэ раз выхвальваецца гэтак званае «нябывалае ў гісторыі людзтва» шчасьце, дружба, раўнапраўнасьць, свабода й незалежнасьць народаў, аб'еднаных — зразумела, «дабраахвотна» — Ленінам і камуністычнай партыяй ў Савецкім Саюзе.

Як доказ дружбы народаў СССР, партыйны ворган ЦК КП Беларусі падае, між іншым, і такі прыклад: «... Пасланцы беларускага народу працуюць на новабудоўлях Сібіру й Далёкага Ўсходу, здабываюць вугаль на шахтах Украіны, вырошчваюць збожжа на палёх Казахстану, сякуць лес у Карэліі. Так у гэраічнай працы на вялікіх будоўлях сямігодкі гартуецца й мацнее братняя дружба нашых народаў».

Гартаваць і ўмацоўваць дружбу й супрацоўніцтва паміж народамі — справа, бязумоўна, вельмі шляхотная. Але гаварыць так аб гэтым можна толькі тады, калі такое супрацоўніцтва разьвіваецца на запраўды свабодных, дабраахвотных і раўнапраўных прынцыпах, калі яно ня прыносіць ніякай шкоды паасобным людзям і народам. Хто-ж не закрывае вачэй на запраўднае палажэньне справаў, той ведае, што ў Савецкім Саюзе партыйнае кіраўніцтва гэтае супрацоўніцтва будуе на зусім іншых прынцыпах, якія пярэчаць першапачатковаму сэнсу самога слова, «супрацоўніцтва».

Ужо на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў бальшавіцкая ўлада ўсімі спосабамі партыйнага гвалту й дзяржаўнага ціску адрывае Беларусаў ад роднага краю й гоніць у Сібір і на Далёкі Ўсход, у Карэлію й Казахстан. У замен-жа Беларусь атрымлівае тое, што беларускія палі зарастаюць кустарнікамі й пакрываюцца балотамі, ператвараючыся ў «новую цаліну», як гэта няраз былі змушаныя прызнаваць і высокапастаўленыя менскія партыйныя вельможы, на чале з Мазуравам. Гэта ў выніку бальшавіцкай гэтак званай «дружбы й супрацоўніцтва паміж народамі» колькасьць насельніцтва БССР, як яшчэ раз пацьвердзіў нядаўны перапіс, усьцяж памяншаецца на цэлыя мільёны. А што яшчэ горшае, гэта тое, што, ня гледзячы на дасюлешняе апусташэньне Беларусі, і далей прыходзяць паведамленьні аб высылцы новых кантынгэнтаў беларускай моладзі на асваеньне заўральскіх прастораў і на розныя іншыя «камуністычныя будоўлі». Гэтая высылка й далей суправаджаецца крыклівымі фразамі савецкай прэсы й радыя аб «дабраахвотнасьці», «энтузіязьме», «дружбе», «супрацоўніцтве».

Залганасьць бальшавіцкай прапаганды аб раўнапраўнасьці падсавецкіх нацыяў магчыма найбольш яскрава выкрываецца на прыкладзе безагляднай русыфікатарскай палітыкі Масквы і ейных стаўленікаў на мясцох. Чырвоная маскоўская арыстакратыя прызнаецца, што мільёны Беларусаў высланыя з Бацькаўшчыны ў розныя далёкія раёны СССР. Яна замоўчвае, што мільёны беларускага насельніцтва й сотні тысяч квадратных кілямэтраў беларускай этнаграфічнай тэрыторыі былі ў розныя часы бяз згоды беларускага народу далучаныя да РСФСР і іншых саюзных рэспублікаў. Але гэта-ж таксама незапярэчны факт. І нідзе, ні ў Сібіры, ні ў Казахстане, ні ў Смаленскай ці іншых этнаграфічна беларускіх вобласьцях, далучаных да РСФСР, ні на беларускай Віленшчыне, далучанай цяпер да Літоўскай ССР — нідзе ў СССР, апрача БССР, бальшавікі не дазволілі стварыць аніводнай беларускай школы, каб беларускія дзеці маглі вучыцца ў сваёй роднай мове, або, прынамся, вывучаць мову бацькоў, як прадмет.

Аб чым гэта сьветчыць: аб «раўнапраўнасьці» й «дружбе» паміж народамі? А аб чым сьветчыць тое, што беларуская мова з кажным годам усё больш выціскаецца расейшчынай і ў самой «сувэрэннай» БССР?

Тут, аднак, варта адзначыць, што дружба, салідарнасьць і супрацоўніцтва паміж моладзяй розных нацыянальнасьцяў, якую бальшавіцкая сыстэма выганяе з бацькаўшчыны й бязьлітасна эксплятуе, існуе запраўды, толькі не ў такой форме, як гэтага жадала-б партыя й як гэта размалёўвае ейная прапаганда. Гэтая дружба й салідарнасьць былі яскрава прадэманстраваныя паўгоду таму на будаўніцтве Тэмір-Таўскага мэталюргічнага камбінату ў Казахстане. Як мы ўжо паведамлялі ў «Бацькаўшчыне», тысячы беларускай і ўкраінскай моладзі, загнанай рэжымам у нялюдзкія ўмовы жыцьця й працы на будаўніцтве прыгаданага заводу, дружна й салідарна схапіліся за зброю й паміралі пад агнём аддзелаў дзяржаўнай бясьпекі, баронячы свой гонар і правы на людзкое існаваньне. Гэта прыклад запраўднай дружбы, дружбы нікім не накінутай, дружбы зьняволеных, але свабодных духам і бястрашных маладых людзей, дружбы, выкаванай супольнай нядоляй. Якой хвальшывай і нікчэмнай у вабліччы гэтай дружбы становіцца афіцыйная бальшавіцкая дружба?

У вабліччы гэтага мала абгрунтаванымі здаюцца радкі зь вершу Максіма Танка «На цаліне», зьмешчанага ў І-ым нумары часапісу «Полымя» за гэты год. Свой верш аб долі маладых беларускіх матак, якія апынуліся ў казахстанскіх

(Заканчэньне на 2-ай бачыне)

# Як пастанаўляецца, так і выконваецца...

У канцы красавіка сёлета ў Менску адбыўся пленум ЦК камуністычнай партыі Беларусі. На гэтым пленуме шмат увагі было зьвернута на выкананьне сацыялістычных забавязаньняў для павялічэньня вытворчасьці й продажы дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў у 1960 годзе, у прыватнасьці — у першым квартале. На пленуме было таксама закранута пытаньне аб ходзе веснавой сяўбы.

Вось-жа, паводля заведзенага парадку, у пастанове Пленуму перш за ўсё адзначана, што ў першым квартале 1960 году калгасы й саўгасы дабіліся некаторых удачаў у справе вытворчасьці й нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Павялічылася вытворчасьць мяса й малака ў калгасах і саўгасах. Усе вобласьці датэрмінова выканалі плян першага кварталу па продажу мяса й малака дзяржаве. Навет павялічылася колькасьць буйнай рагатай жывелы. Таксама асьцярожна адзначана, што калгасы й саўгасы крыху лепш падрыхтаваліся да веснавой сяўбы, чымся летась.

Аднак гэтымі дасягненьнямі закрываюцца ня зусім вясёлыя справы. У пастанове адзначана, што «у рэспубліцы ня створаны такія абставіны й напружанасьць у працы ды такія патрабаваньні да кадраў, якія-б гарантавалі пасьпяховае выкананьне прынятых працаўнікамі сельскай гаспадаркі забавязаньняў на 1960 год».

Што азначае гэтая туманная фармулёўка? Што трэба разумець пад кадрамі й працаўнікамі сельскай гаспадаркі?

У свой час існавалі пэўныя нормы здачы дзяржаве прадуктаў сельскай гаспадаркі з кажных сто гэктараў зямельнай плошчы ў калгасе. Апошнія два гады ўжываецца іншы спосаб забраць ад калгаснага сялянства найбольшую колькасьць збожжа, малака, мяса. Асноўнай формай зьяўляюцца цяпер гэтак званыя сацыялістычныя забавязаньні. Звычайна склікаюцца рэспубліканскія нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі. На такую нараду заклікаюцца знатныя даяркі, сьвінаркі з высокімі ўзнагародамі, старшыні буйных калгасаў, сакратары райкомаў, абкомаў. На такой нарадзе, пасьля дакладу сакратара ЦК КП Беларусі, прапануецца гэтым перадавіком прыняць сацыялістычнае забавязаньне ад імя ўсіх калгасьнікаў рэспублікі. У гэтым забавязаньні пералічваецца колькі здаць дзяржаве збожжа, бульбы, лёну, цукровых буракоў, мяса, масла й іншых прадуктаў. Далей праводзяцца ў такім-жа парадку нарады ў вобласьцях, раёнах і ўрэшце даходзіць гатовае заданьне да калгасу.

І ў мінулыя гады практыкаваліся сацыялістычныя забавязаньні, але яны насілі фармальны характар. Выкананьне іх звычайна не правяралася. Цяпер сацыялістычнае забавязаньне зьяўляецца законам, які падлягае выкананьню.

Вось-жа перад тым, як склікаць пленум, адбылася праверка выкананьня гэтых сацыялістычных забавязаньняў. Пленум і адзначыў, што кадры, гэта значыць партыйна-савецкая верхавіна, якая кіруе й муштруе «працаўнікамі зямлі» (калгасьнікамі), недастаткова моцна й настойліва прымушае калгаснае сялянства выконваць прынятыя безь яго ўдзелу сацыялістычныя забавязаньні.

Якія запраўдныя ўдачы дасягнуты ў першым квартале калгасамі й саўгасамі? Перш за ўсё 60 раёнаў Беларусі ня выканалі сацыялістычных забавязаньняў у першым квартале ў вытворчасьці мяса й 41 раён — у вытворчасьці малака. У пастанове пералічваюцца некаторыя раёны, якія выпрадукавалі малака й мяса менш, чымся ў мінулым годзе.

Пастанова пленуму з абурэньнем адзначае, што саўгасы рэспублікі ў першым квартале выпрадукавалі малака й мяса на сто гэктараў значна менш, чымся калгасы. Асабліва адстаюць саўгасы Магілеўшчыны. Як і ў мінулыя гады калгасы й саўгасы здаюць дзяржаве лядашчую неадкормленую жывёлу. У пастанове адзначана, што нічым нельга апраўдаць шматлікія выпадкі памору жывёлы на калгасных і саўгасных фэрмах.

Пленум ЦК патрабуе павесьці змаганьне за недапушчальнасьць самых дробных недахопаў, супраць бесклапотнасьці, пустазвонства, парадных выступленьняў. Каго-ж, аднак, абвінавачваць у пустазвонстве, калі гэтай хваробаю апанаваныя ў першую чаргу камуністычна-камсамольскія арганізацыі? Ці-ж гэта не пустазвонства, калі пленум запісвае ў сваёй пастанове: «у травені вывесьці ўсіх сьвіньней і буйную рагатую жывёлу ў летнія лягеры, а ўсе сьвінарнікі перабудаваць, каб утрымліваць сьвіньней гуртам. Для атрыманьня высокіх прывесаў ад жывёлы на нагулах падабраць пастухоў. На працягу красавіка-траўня забясьпечыць злучку й штучнае асемяненьне ўсіх цялушак злучнога ўзросту й кароў, якія ацяліліся да першага красавіка. Сабраць збожжавых культур ня менш 10 цэнтнараў, бульбы — 120—125 цнт. з гэктару». Ды ці варта пералічваць яшчэ іншыя пэрлы камуністычнага пустазвонства, якое называецца «канкрэтным кіраўніцтвам калгасамі й саўгасамі»!

Ці ня крыўдна слухаць гэтае пустаслоўе калгаснаму сялянству? Ад такіх дырэктываў запраўды адпадзе ўсякае жаданьне працаваць у калгасах і саўгасах. А таму й зразумела, чаму ўсё маладое, здаровае, ініцыятыўнае пакідае родную вёску, каб ня чуць штодзённых, абрыдлых дырэктываў.

**В. Б.**

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012



# Чарговыя сымптомы канфлікту ў Крамлі

Апошнімі тыднямі ўсё ясьней пачалі выяўляцца шматлікія сымптомы чарговага нутранога канфлікту ў савецкай кіраўнічай верхавіне, які ня мог не наступіць незадоўга да нарады на найвышэйшай узроўні.

Найбольш значнымі з гэтых сымптомаў зьяўляюцца наступныя:

1) Нарада створанага ў сакавіку 1958 году цэнтру камуністычных партыяў сьвету, закумафляванага пад выглядам «Рэдакцыйнае рады» часапісу сусьветнага камуністычнага руху «Праблемы міру й сацыялізму», што адбылася 13—16 красавіка сёлета ў Празе, і ў якой прыймалі ўдзел прадстаўнікі 36-х камуністычных партыяў сьвету («Правда», 24. 4. 1960). Шматлікае паказвае на тое, што гэтая канфэрэнцыя была прысьвечана праблеме далейшага разьвіцьця камуністычнага руху ў сувязі з высунутай Хрушчовам канцэпцыяй мірнага суіснаваньня й хуткім скліканьнем канфэрэнцыі кіраўнікоў урадаў чатырох вялікіх дзяржаваў.

2) У дні сьвяткаваньня 90-годзьдзя з дня нараджэньня Леніна (22 красавіка 1960) асабліва яскрава праявілася прынцыповае разыходжаньне савецкага й кітайскага камуністычнага кіраўніцтва ў інтэрпрэтацыі канцэпцыі мірнага суіснаваньня камуністычнага блёку зь некамуністычным сьветам.

3) Выкліканьне ў Маскву на 1-га травеня савецкіх амбасадараў з найбольш значных дзяржаваў сьвету. Ня трэба забывацца, што шматлікія савецкія амбасадары зьяўляюцца сябрамі або кандыдатамі ЦК КПСС. Гэта давала права тлумачыць іх выклік, як прызнак надыходзячага скліканьня надзвычайнага пленуму ЦК.

4) Зьяўленьне ў савецкай прэсе публікацыяў, прысьвечаных сталінскаму пэрыяду й якія паводля сваёй вайстрыні перавышаюць навет крытыку гэтага пэрыяду Хрушчовам на XX зьезьдзе КПСС, якая прывяла да разьвянчаньня крамлёўскага дыктатара (Разьдзелы з паэмы А. Твардоўскага, «Правда», 29. 4. 1960).

Гэтая апошняя публікацыя, зьяўляючыся відавочна партыйным «заказам», была разлічана савецкім кіраўніцтвам на здабыцьцё сымпатыяў і папулярнасьці ў шырокіх колах жыхарства перад надыходзячымі паважнымі падзеямі.

5) Пасьля сьвяткаваньня 1-га травеня зьявіліся некаторыя дадзеныя аб важных зьменах у галоўным камандаваньні савецкай арміі. Гэтыя зьмены цяжка матываваць чыста вайсковай неабходнасьцяй. Яны хутчэй паказваюць на дасьпяваючы крызыс у кіраўнічай верхавіне й няўхільнасьць яшчэ больш важнейшых зьменаў у будучыні.

У дзень адкрыцьця сэсіі Вярхоўнага Савету СССР 5-га травеня сёлета маскоўскае радыё падало «інфармацыйнае паведамленьне» аб паседжаньні пленуму ЦК КПСС і Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР, на якім была прынята пастанова аб 11 звальненьнях і 8 новых назначэньнях у партыйным і ўрадавым кіраўніцтве.

Асаблівую цікавасьць выклікае той факт, што гэтая ператасоўка ў кіруючай верхавіне была пастаноўлена ня проста пленумам ЦК КПСС, а на супольным паседжаньні трох вышэйшых савецкіх інстанцыяў: ЦК, Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР і Савету Міністраў СССР. Зразумела, усе пытаньні падобных звальненьняў і назначэньняў наважвае ЦК, аднак юрыдычна ён да гэтага не ўпаўнамочаны, а дзеля гэтага ўсе зьмены ў кіраўніцтве, што адбыліся 4-га травеня, прадстаўляліся аднасасова як пастанова ўсіх вярхоўных інстанцыяў.

Трэба адцеміць, што такі парадак апублікаваньня пастановы гэтых інстанцыяў без канкрэтнага паведамленьня аб тым, якія пытаньні разьбіраліся на гэтым супольным паседжаньні й чым была выклікана ўся гэта ператасоўка, паказвае на надзвычайнасьць гэтае нарады й пацьвярджае дапушчэньне аб тым, што ў гэтыя дні ў савецкай кіруючай верхавіне разыгралася чарговае й жорсткае нутраное змаганьне. Стыль скліканьня такога паседжаньня ня мог не напамінаць савецкую нараду гэтых-жа інстанцыяў, што адбылася пад загрозай «разброду й панікі» пасьля сьмерці Сталіна.

Дапушчэньне аб адбыўшымся змаганьні на вярхох савецкага кіраўніцтва пацьвярджаецца й тым, што паведамленьне аб пленуме было апублікавана, як і калісьці, ужо пасьля яго правядзеньня, у той час, як усе апошнія пленумы ЦК у парадку «новай традыцыі» абвяшчаліся за некалькі мэсяцаў да іх склікаваньня; парадак дня іх публікаваўся загадзя, і самі яны праводзіліся з прыцягненьнем вялізарнае колькасьці асобаў, што ня мелі ніякага дачыненьня да ЦК і навет да партыі (вучоныя, інжынеры, работнікі й кальгасьнікі, прадстаўнікі розных «грамадзкіх» арганізацыяў і прэсы).

Ператасоўка, праведзаная 4-га травеня на столькі складаная, што спачатку здаецца цяжка вызначыць асноўны палітычны стрыжань, вакол якога яна адбылася.

Ключом да вызначэньня таго, вакол чаго разыгралася змаганьне ў савецкім кіраўніцтве, у значнай ступені зьяўляюцца: даклад Хрушчова на сэсіі Вярхоўнага Савету СССР (5-га травеня), ягонае заключнае слова (7-га травеня) і апошняя, фармальна самая буйная зьмена, што адбылася ў вапошні дзень правядзеньня сэсіі — зьняцьце Варашылава з пасады «прэзыдэнта» савецкай рэспублікі і назначэньне на ягонае месца Л. Брэжнева.

У дакладзе Хрушчова трэба адзначыць перадусім ягоную нязвычайнасьць. У ім поўнасьцяй адсутнічаюць тыпічныя для Хрушчова канстатацыі недахопаў і праклямаваньне рэцэптаў для адхіленьня іх; уся першая палова дакладу, што мела дачыненьне да нутраное палітыкі, пабудавана вылучна на ўсхваляньні савецкіх дасягненьняў і дагматычна пабудаваным абвешчаньні будучых дабрадзействаў для савецкага жыхарства, якія напрацягу найбліжэйшых гадоў маюць быць яму забясьпечаныя. Ужо сам назоў дакладу «Аб скасаваньні падаткаў з работнікаў і службоўцаў ды іншых мерапрыемствах, накіраваных на павышэньне дабрабыту савецкага народу» быў разьлічаны вылучна на тое, каб выклікаць спрыяльнае ўражаньне сярод шырокіх масаў савецкага жыхарства й стварыць прапагандовую шуміху заграніцай, хаця гэтыя «мерапрыемствы» практычнага значэньня пакуль што ня маюць.

Уважны разгляд выказваньняў Хрушчова, зробленых у другой палове ягонага дакладу, дазваляе зрабіць вывад аб тым, што Хрушчоў у ацэне сусьветных палітычных абставінаў і пэрспэктываў нарады на найвышэйшай узроўні заўважна зьмяніў сваё папярэднае гледзішча.

Заместа абвешчаньня «вясны» ў міжнародных дачыненьнях і аптымістычнага падчырквання магчымасьці дасягненьня дамоўленасьці на Парыскай канфэрэнцыі, што былі ляйтматывам ягоных шматлікіх папярэдніх выступленьняў, у дакладзе на сэсіі Хрушчоў падчыркнуў факт значнага пагоршаньня ў вонкавапалітычных дачыненьнях. Ён у вельмі грубых выражэньнях абвінаваціў заходнія дзяржавы й рад іхных дзяржаўных дзеячоў у нежаданьні «разумнага» ўрэгуляваньня важнейшых пытаньняў міжнароднага значэньня й выказаў сумлевы што да магчымасьці дасягненьня дадатніх вынікаў на нарадзе ў Парыжы.

Уся гэтая вонкавапалітычная пераарыентацыя была Хрушчовам штучна сканструаваная й падмацаваная шляхам хітрага выкарыстаньня выпадку із амэрыканскім самалётам.

Фармулёўкі ў выражэньнях Хрушчова пры ацэне выпадку з амэрыканскім самалётам ужо ў дакладзе (5. 5. 1960) паказваюць на тое, што савецкая палітыка шляхам штучнага выкарыстаньньня гэтага прэцэндэнту сьведама ўзыходзіць на праславутыя пазыцыі «вастрыя нажа», да праблемы магчымасьці збройнага канфлікту ў будучыні.

І хаця Хрушчоў канстатаваў, што **«пакуль што»** яшчэ няма на гэта дастатковых асноваў, у сваім заключным слове (7. 5. 1960) ён яшчэ больш згушчае хварбы, абліваe кіруючыя амэрыканскія колы патокам адборнай, зусім няпрыстойнай для дзяржаўнага дзеяча лаянкі, і абвяшчае стварэньне Галоўнага камандаваньня ракетных войскаў пад камандай галоўнага маршала артылерыі Нядзеліна.

Што ў запраўднасьці прымусіла Хрушчова, які бязумоўна, арыентуецца ў пытаньнях і чужых і собскіх разьведвальных традыцыяў, так драматызаваць гэты інцыдэнт, падрыхтоўваючы магчымасьць пераарыетацыі савецкай вонкавай палітыкі на пазыцыі прызнаньня непазьбежнасьці збройнага сутыку з Захадам?

Відавочна, гэта, як і шмат чаго іншага ў вагульным камплексе надыходзячых падзеяў, было ў першую чаргу беспасярэднім вынікам разыходжаньняў у ацэне канцэпцыяў мірнага сужыцьця з Пэкінам ды разыходжаньняў у камуністычным лягеры наагул.

Гэтыя разыходжаньні завойстрыліся ўжо на нарадзе кіраўнікоў дзяржаваў Варшаўскага пакту ў Маскве ў лютым гэтага году. Назіральнік ад камуністычнага Кітаю Канг-Чэнг заявіў на ёй, што ЗША былі й застаюцца галоўным «ворагам», і, такім чынам ніякіх даўжэйшых замірэньняў у сьветавых дачыненьнях ня можа быць ды падчыркнуў, маючы на ўвазе канфэрэнцыю на найвышэйшай узроўні, што ніякія пагадненьні, зробленыя бяз удзелу Кітаю, ня могуць быць для яго забавязваючымі.

(Заканчэньне на 3-яй бачыне)

## ДРУЖБА Й РАЎНАПРАЎНАСЬЦЬ...

(Працяг з бач. 1)

стэпах, Максім Танк канчае такімі словамі:

«І маткі, сьпяваючы песьні пра Бая,
Дзяцей атуляючы ласкаю чулай,
Ў бок Нёмана, дзе гэты напеў самі чулі,
З днём кажным радзей з-пад рукі паглядаюць».

Максім Танк, відавочна, хацеў сказаць, што беларускія маткі зжываюцца з казахстанскай цалінай і паволі наагул перастануць паглядаць у бок роднага беларускага Нёману. Факты-ж сьветчаць аб тым, што нязломнасьць духу беларускай моладзі дае ёй змогу рабіць вялікія гэройствы і перамагаць найбольш цяжкія выпрабаваньні. Таму можна быць упэўненымі, што й сваe бацькаўшчыны яна ніколі не забудзецца, куды-б яе ня кідаў дрэнны лёс, і вернецца назад у першы паходны момант, каб у дружнай сям'і запраўды свабодных, незалежных і раўнапраўных народаў сьвету — як казаў Янка Купала — «адбудаваць свой збураны пасад».

А. З.

# Перад Парыскай Канфэрэнцыяй

(Заканчэньне з 1-ай бач.)

ваньне міру й суіснаваньне з усімі краінамі сьвету, цьвёрда й станоўча паўтарыў ранейшы рэцэпт ліквідацыі галоўных прычынаў гэтага напружаньня: разьвязаньне праблемы раззбраеньняў, нямецкага пытаньня й справы Бэрліну.

У пытаньні раззбраеньняў ён паўтарыў свой ранейшы праект татальнага раззбраеньня, зложаны перад сэсіяй Задзіночаных Нацыяў у Нью Ёрку восеньню мінулага году. Заходнія дзяржавы жадаюць узаемнага раззбраеньня пад няўхільнай умовай раўначаснае кантролі гэтага раззбраеньня, як гарантыі, што будзе яно ўзапраўды праводжанае. Хрушчоў-жа супраць усякай кантролі падчас працэсу самога раззбраеньня, заплянаванага ім на пэрыяд чатырох гадоў, бо, на ягоную думку, такая кантроля была-б выкарыстоўваная праціўным бокам дзеля мэтаў шпіянажу. Затое ён згаджаецца на ўзаемнае кантраляваньне толькі пасьля заканчэньня працэсу раззбраеньняў. Дык ясна, што Захад не ўважае за магчымае навет паддаваць пад дыскусію такую канцэпцыю раззбраеньняў без адначаснае кантролі ягонага ажыцьцяўленьня.

У нямецкім і бэрлінскім пытаньні Хрушчоў таксама паўтарыў сваю ранейшую канцэпцыю, ня ўносячы ў яе найменшых зьменаў. Паймення, ён зажадаў падпісаньня мірнага дагавору з абедзьвюма нямецкімі дзяржавамі — усходняй і заходняй, а з заходняга Бэрліну стварэньня вольнага гораду пасьля вываду зь яго акупацыйных войскаў заходніх дзяржаваў. У практыцы гэта абазначала-б юрыдычнае й фактычнае замацаваньне падзелу Нямеччыны й зрачэньне заходнімі дзяржавамі іхных правоў у заходнім Бэрліне.

З гэтакай палітычнай праграмай, выключаючай якое-небудзь пагадненьне з Захадам, едзе Хрушчоў у Парыж.

Ягоная прамова ў Вярхоўным Савеце вызначалася, як ніколі яшчэ перад гэтым, няскрыванымі ваяўнічымі акцэнтамі й дэманстрацыяй сілы. Дробны сам па сабе інцыдэнт нарушэньня савецкай тэрыторыі амэрыканскім самалётам, няхай сабе й у мэтах шпіянажу, які на асабісты загад Хрушчова быў зьбіты, ён паднёс да разьмераў ваеннае агрэсыі й прыгразіў, што ў падобных выпадках у будучыні савецкія ракеты беспасярэдна заатакуюць базы, зь якіх такія самалёты вылятаюць. У словах, поўных лаянкі й іроніі, ён назваў палітыку Заходняй Нямеччыны палітыкай рэванжу, а амэрыканскую палітыку палітыкай правакацыі. Палітыку Хрушчова, сфармуляваную ў ягонай прамове, можна коратка схарактарызаваць, як палітыку на мяжы вайны.

У грубых, пазбаўленых усякага дыпляматычнага такту й абразьлівых словах пад адрысам заходніх дзяржаваў і іхных кіраўнікоў перайшоў Хрушчоў усякія межы прызваітасьці. Робячы алюзію да заходніх дзяржаваў, ён зрабіў наступнае прыраўнаньне: **«Няхай капіталізм дажывае свой век, як стары конь, які адрахлеў, у канцы канцоў выцягнуў ногі і гаспадар выкідае яго вон».**

У сваім абнагленьні Хрушчоў здабыўся навет на такі беспрэцэдэнтны ў дыпляматычных дачыненьнях крок, як кінуць асабістую абразу пад адрысам віцэпрэзыдэнта Амэрыкі Ніксана. Выказаўшы абурэньне, што Айзэнгаўэр толькі да 23-га траўня будзе асабіста прыймаць удзел у канфэрэнцыі, а пасьля гэтай даты мае яго заступіць Ніксан, Хрушчоў адцеміў: **«Спадар Ніксан думае аб чым хаця, але менш за ўсё аб тым, каб дасягнуць дамоўленасьці ў спрэчных пытаньнях, ліквідаваць стан напружаньня, ліквідаваць халодную вайну й спыніць перагонку зброеньняў».** А ў сувязі з гэтым ён заявіў: **«Баюся, што калі спадару Ніксану даручаць весьці гэтыя перагаворы, дык каб не паўстала палажэньне, падобнае на тое, аб якім гаворыцца ў ведамай народнай прыказцы: «Пусьцілі казла капусту пільнаваць».**

Не падлягае найменшаму сумлеву, што пры такіх аднабаковых патрабаваньнях і пры такім тоне гутарак канфэрэнцыя мусіць скончыцца поўным правалам. Навет сам Хрушчоў гэтага спадзяецца, але ўсю віну за няўдачу канфэрэнцыі ўжо згары звальвае на заходнія дзяржавы, калі заявіў нядвузначна: **«Калі перагаворы ня будуць мець посьпеху, дык народы цэлага сьвету зразумеюць, хто вінават гэтаму».**

Ужо сяньня з усей упэўненасьцю можна прадбачыць, што канфэрэнцыя для Захаду ня можа прынесьці ніякіх пазытыўных вынікаў. Вылучна абаронная пазыцыя Захаду, адсутнасьць станоўчасьці й цьвёрдасьці ў ягоных патрабаваньнях, разыходжаньні ў многіх пытаньнях паміж заходнімі саюзьнікамі пераканалі верхаводаў Крамля, што бязь ніякай рызыкі могуць узмоцніць свой наступ супраць вольнага сьвету, звальваючы адначасна на яго віну за ўсе няўдачы ў перагаворах.

Язэп Караневускі

Ул. Глыбінны

# Да родных берагоў

(Апавяданьне эмігранта)

Працяг з № 18 (502)

Пачало вечарэць. За фіранкамі вакон ўжо сутанела. У мораку вячорнага змроку сябры пілі асалоду ўзаемна-цікавае гутаркі. Неўзабаве Алесява маці запаліла газьнічку, паставіла на стол самавар, шклянкі, цукарніцу, напоўненую дробнымі кавалачкамі сіняватага рафінаду, паставіла колькі талерак з бутэрбродамі й печывам.

За прыемнай сяброўскай гаворкай час прабягаў незаўважна. Яны прыгадвалі агульных сяброў; Мацей гаварыў пра тых, хто ўжо цалкам прадаў сваё сумленьне афіцыйнай казёншчыне.

— Ад майго бабруйчаніна Тараса Бычкова ўжо ня прыходзіцца чакаць нічога вартаснага. Зусім апусьцеў чалавек. Толькі й трымаецца чарговае інструкцыі з ЦК. Таму й трапляе ўжо каторы год на пасаду Старшыні Праўленьня Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў Беларусі. Калісь чалавек пісаў добрыя рэчы. Ягонага балагола ўсе школьнікі чуць ні на памяць памятаюць. Добра калісьці, з душою й паэзіяй ён маляваў вобразы беларускіх чыгуначнікаў. А цяпер за ягонаю старою душою толькі адзін кар'ерысты й застаўся. Толькі і ўсяго клопату цяпер у ім, каб ня збочыць ды ўтрымацца на пасадзе чыноўніка ад літаратуры. Ад былога чалавека толькі футарал знадворнага падабенства й застаўся.

— А наагул, бязьлюдзьдзе заядае нас тут усіх. От толькі Спалахоўскія й задаволеныя, ім хапае свае жонкі й дробных службовых посьпехаў. Ад іх яны і ўзьнімаюць нос у гору. Вакол запанавалі ёлупы з курынымі мазгамі. Жывой думцы й пачуцьцю няма мейсца. Казёншчына забівае ўсё творчае. Летась я цэлы год працаваў над дыплёмнай працай аб паэзіі. Працаваў, як вол, перагледзіў сотні розных тамоў, перагарнуў шмат тагачасных газэтаў. Я цалкам жыў тым часам. Дык вось там я пабачыў, чым жыло тое пакаленьне людзей. Яны мелі некаторую свабоду выказаць усё, што думалі. О, якое гэта шчасьце мець права выказвацца, чым душа напоўнена. Расказаць аб таямніцах чалавечага сэрца без аглядкі на розныя недарэчныя абвінавачаньні. А ў нас тут дробныя душы тое й робяць, каб вынішчыць багацейшую за іхнюю душу і тым ня даюць сабе патрэбы ўзьнімацца да вышэйшага ўзроўню. Нівэліроўка, браце, на адзін капыл забівае нашае нацыянальнае й творчае сумленьне. Таму, не чакаю я нічога вартаснага ад гэтага пакаленьня. Таленты панішчаны, а новыя глумяцца яшчэ да таго, як яны набудуць свой собскі твар.

Алесь слухаў уважліва Мацея і ў кажным слове лавіў падцьверджаньне сваіх уласных думак. Ён усё гэта адчуваў і сам, але калі ён чуў з вуснаў асобы, што мела беспасярэдні дотык да гэтых справаў, ён больш упэўніваўся, што няма чаго асабліва бедаваць з прычыны немагчымасьці вярнуцца да літаратурнага жыцьця. Яму, выгнанцу, зачыненыя ня толькі брамы да літаратуры, але ён навет ня можа на доўга спыніцца ў родным горадзе.

— Так ці іначай, тут няма шчасьця, трэба шукаць яго ў іншым мейсцы, — рабіў выснаў Алесь з усяе гэтае сумнае гісторыі, расказанае такім дарагім цяпер сябрам, надзейным сьведкам ліха, што апанавала сьвятое беларускаму сэрцу места.

Горка было абодвым ад сьведамасьці, што Алесю няма месца ў роднай сталіцы. Заўтра, ужо рана ён мусіць пакідаць родную хату й валачыся ў сьвет шукаць магчымасьці працы. І што яму прынясе наступны дзень — займала голаў Алеся і час па часе азмрачвала радасьць такое шчасьлівае нагоды, як наведаньне яго удумлівым паэтам Мацеем. У сардэчнай бяседзе час прамінуў з хуткасьцяй быстраногага аленя. Яны і не заўважылі, як гадзіньнік адстукаў дванаццаць. Калі агледзеліся на час, дык было каля першай гадзіны начы. Мацей пачаў зьбірацца дахаты.

— От добра вышла, што жонкі якраз няма дома, паехала на пабыўку дахаты да бацькоў у мястэчка. І нагаварыўся я з табою гэтак, як ужо даўно ні з кім не гаварыў. Гэта запраўды было шчасьцем сустрэць чалавека. У наш век гэта ня часта здараецца. Ну, дык пры першай нагодзе чакаю цябе ў мяне. Я як раскажу жонцы пра наша спатканьне, дык яна трызьніць будзе днём тваго прыезду. Дзякуй, браце, за тое, што ўважна слухаў мяне. Ну, то выходзьма, думаю правядзеш крыху мяне, — сказаў Мацей і зноў паклаў руку на Алесява плячо.

— О, дарагі Мацей, — узрушана адказаў Алесь. — Я бязьмежна ўдзячны табе за гэту высокародную думку наведаць мяне. Ты прыўзьняў мой заняпалы дух. Абодвы Вы, ты і Ворны, сваёю ўвагаю да мяне прабудзілі зноў веру ў чалавека. Калі я ўжо зьняверыўся быў, губляў усялякую надзею на сяброўскую шчырасьць і магчымасьць прыязнага адналньня з таварышамі мае маладосьці, ты наведаў мяне ў найцяжэйшую часіну майго жыцьця. Цяпер я зноў ачуняў, напоўніўся веры ў добрае сэрца чалавека. Не, калі ёсьць такія людзі, як ты ды Ворны, дык ніколі не загіне й справа нашае бацькаўшчыны. Дзякуй табе ад усяе душы й ад маіх старых бацькоў, якія таксама заадно са мною напоўнены ўдзячнасьці табе за наведаньне іхняга бязладнага сына.

І ён абяруч пацісн уў яму ягоную руку. Усьлед і старыя па чарзе ціснулі руку Мацея, заціскаючы няўмольную сьлязу расьці, што набягала ім на вочы.

### IX.

Ужо аж за першую гадзіну ўначы выйшлі Алесь з Мацеем з хаты. Сьвежы вецер ціха веяў з боку Сьвіслачы. Яны падыйшлі да Татарскага маста. Удалячыні маячылі расьцярушаныя ў прасторы нізка над зямлёю аганькі. Зьлева уздоўж ракі берагам дзе-ня-дзе яшчэ з хатаў бліскацелі начныя газьнічкі. Насупраць татарскімі агародамі распасьцерлася ў цемені чорная, як смоль, прастора. Яна маўчала нявымоўную таемнасьцяй. Толькі берагі ракі вылучаліся нявыразістым зарысам пераліўнае, вечна жывучае й гаварлівае плыні. Рака плюхалася аб берагавыя каменьні, адбівала ледзь прыкметныя пас-

© PDF: Kamunikat.org 2012
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

